А.І. Смолік

## *Рэалізацыя інтэлектуальна-творчага патэнцыялу асобы ў працэсе самадзейнай мастацкай творчасці*

Прафесійнае мастацтва адыгрывае важную ролю ў далучэнні сацыяльнага суб'екта да гісторыі і культуры. Але ў рэспубліцы існуе значная сетка дробных сельскіх паселішчаў, большасць якіх не налічвае і 200 жыхароў. У сувязі з гэтым значна ўскладняецца праблема ўзаемаадносін прафесійных калектываў з сельскім гледачом. Шматлікія сацыялагічныя даследаванні сведчаць аб тым, што розныя сацыяльна-дэмаграфічныя групы насельніцтва рэспублікі, маючы неаднолькавыя магчымасці наведвання ўстаноў мастацкай культуры, нераўнамерна прадстаўлены ў аўдыторыях тэатраў, філармоній, канцэртных залаў і музеяў. Асабліва вялікія разыходжанні назіраюцца паміж гарадамі і сельскай мясцовасцю. Статыстычны аналіз паказвае, што па колькасці тэатральных спектакляў, якія прыпадаюць на 1 тыс. жыхароў, гэты разрыў у пачатку 90-х гадоў складаў 3,6 разы, па наведванні спектакляў – 2,6, канцэртаў – 1,9 (1). У гэтых умовах рэгіянальныя ўстановы культуры з'яўляюцца безальтэрнатыўнымі цэнтрамі развіцця мастацкай творчасці насельніцтва і каардынатарамі культурнага жыцця свайго рэгіёна. Вывучэнне сацыяльных функцый самадзейнай мастацкай творчасці дазваляе вызначыць у якасці яе галоўнай функцыі рэалізацыю духоўных інтарэсаў і патрэбнасцей асобы.

Вызначэнне прыярытэтных напрамкаў развіцця нацыянальнай культуры, пошук і ўкараненне новых праектаў і мадэляў сацыяльна-культурнага жыцця насельніцтва асабліва актуальныя на рэгіянальным узроўні. Відавочна, што менавіта ў рэгіёне сёння складваецца ўласная стратэгія развіцця сферы вольнага часу з улікам сацыяльна-эканамічных і культурна-гістарычных асаблівасцей раёна, культурнага патэнцыялу, патрабаванняў і інтарэсаў насельніцтва.

Аналіз дзейнасці сацыякультурных інстытутаў рэспублікі і рэгіёнаў, найбольш пацярпелых ад чарнобыльскай тэхнагеннай катастрофы, дазваляе зрабіць выснову аб тым, што праблемы стварэння ўмоў для самаразвіцця культурнай сферы вольнага часу, пошук новых падыходаў да вызначэння асноў культурнай палітыкі вырашаліся на рэгіянальным узроўні з улікам сацыяльна-эканамічных асаблівасцей рэгіёна, інтарэсаў і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культурных запатрабаванняў розных катэгорый насельніцтва, культурнага патэнцыялу дадзенай тэрыторыі.

Адной з асаблівасцей Гомельшчыны і Магілёўшчыны з'яўляецца наяўнасць шырокай сеткі культурна-асветных устаноў. Нягледзячы на вельмі цяжкія сацыяльна-эканамічныя ўмовы, дзяржаве і мясцовым уладам удалося захаваць інфраструктуру ўстаноў культуры і забяспечыць яе жыццяздольнасць.

У дзейнасці клубных устаноў, клубаў-бібліятэк галоўная роля адводзілася падтрымцы і развіццю розных формаў аматарскай творчасці. Колькасць гурткоў і калектываў мастацкай самадзейнасці, якія існавалі ў 1997 г. у Гомельскай і Магілёўскай абласцях, дасягнула 5 070 адзінак. Сярод іх харавых і вакальных — 2 499, харэаграфічных – 927, тэатральна-драматычных – 1 373, інструментальных – 281 (2).

Адметную ролю ў сацыяльна-культурным жыцці 80—90-х гадоў адыгрывалі мастацкія самадзейныя калектывы інструментальна-аркестравага жанру. У 1997 г. у Гомельскай і Магілёўскай абласцях існаваў 281 інструментальны калектыў. Але, як сведчаць статыстычныя даныя, у 90-я гады назіралася тэндэнцыя змяншэння колькасці аркестраў і ансамбляў. У параўнанні з 1994 г. іх стала менш на 27 адзінак (3). У кожным канкрэтным выпадку працэс скарачэння калектываў аналізуемага жанру, зразумела, тлумачыцца рознымі прычынамі. Гэта і скарачэнне сеткі ўстаноў культуры, і адсутнасць мастацкіх кіраўнікоў, і немагчымасць набыць музычныя інструменты і г.д. Што тычыцца якаснай характарыстыкі працуючых калектываў інструментальна-аркестравага жанру, то, як сведчаць статыстычныя даныя, назіраўся паступовы рост інструментальных калектываў са званнем "народнага (узорнага)" самадзейнага калектыву. Так, калі ў 1994 г. званне "народнага" ці "ўзорнага" меў 161 калектыў Гомельшчыны і Магілёўшчыны, то ў 1997 г. іх налічвалася 200 адзінак (4). Пераважную колькасць калектываў, якія мелі ганаровае званне, складалі аркестры і ансамблі народных інструментаў. Амаль напалову менш было духавых і сімфанічных аркестраў і вакальна-інструментальных ансамбляў.

Параўнанне колькасных суадносін інструментальных калектываў з колькасцю калектываў іншых жанраў мастацкай самадзейнасці паказвае, што яны не пераважаюць над харавымі, харэаграфічнымі і тэатральна-драматычнымі (рыс.1).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Дыяграма размеркавання гурткоў, калектываў мастацкай самадзейнасці па жанрах (канец 1997 г.)***




***Рыс.1.***

Сярод іх адну трэць складалі дзіцячыя аркестры і ансамблі. Вынікі даследаванняў духоўных запатрабаванняў насельніцтва некаторых раёнаў Гомельскай вобласці даюць падставы сцвярджаць, што музыка па сваёй распаўсюджанасці займала першае і асноўнае месца сярод розных відаў мастацтва. Сярод моладзі асабліва папулярнымі былі: эстрадная музыка, поп-музыка, рок-музыка. Магчыма, гэтым тлумачыцца жаданне 21,1% рэспандэнтаў авалодаць тэхнікай спеваў і ігры на музычных інструментах, 9% хацелі б стаць удзельнікамі вакальна-інструментальных ансамбляў. У вольны час праслухоўваннем музычных запісаў займаліся каля 90% апытаных школьнікаў. У сувязі з гэтым інструментальна-аркестравы жанр з'яўляўся формай выяўлення, выхавання народных талентаў і формай культурнага адпачынку (5).

Даследаванне практычнай сферы дзейнасці аркестраў і ансамбляў паказала, што самадзейныя калектывы бралі актыўны ўдзел у канцэртнай дзейнасці ў сваіх рэгіёнах, удзельнічалі ў конкурсах, аглядах і фестывалях. Так, толькі ўстановамі клубнага тыпу Гомельскай і Магілёўскай абласцей

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

у 1997 г. было праведзена 19 809 мерапрыемстваў з удзелам музычных калектываў (6).

У апошняе дзесяцігоддзе на Усходнім Палессі і беларускім Падняпроўі адбываўся працэс адраджэння нацыянальных вытокаў інструментальнага народнага музіцыравання. Паўсюдна ствараліся капэлы беларускай народнай музыкі, аўтэнтычныя гурты народных музыкаў, з'явілася шмат таленавітых салістаў-інструменталістаў. Праўдзівым адлюстраваннем гэтага працэсу былі шматлікія фестывалі і конкурсы народнай музыкі, у якіх бралі ўдзел ансамблі і аркестры Гомельшчыны і Магілёўшчыны. У першую чаргу неабходна адзначыць фестывалі "Звіняць цымбалы і гармонік", якія пачынаючы з 1987 г. кожны год праводзяцца ў Паставах і іншых гарадах Беларусі. У рамках фестываляў праводзіліся конкурсы гарманістаў, ансамбляў народнай музыкі і аркестраў народных інструментаў. Так, у 1997 г. сярод пераможцаў былі: ансамбль "Скарыначка" з Гомеля, народны музыка-скрыпач І.Лук'янаў з Магілёўшчыны.

Асноўнымі крытэрыямі для вызначэння пераможцаў з'яўляліся: сцэнічная культура, выканальніцкае майстэрства, выконваемая праграма (рэпертуар для музыкантаў павінен быў адпавядаць менавіта таму рэгіёну, які прадстаўлялі музычны калектыў ці індывідуальны выканаўца). Падчас фестывалю працавала адкрытая творчая лабараторыя выканаўцаў на народных інструментах, якую вялі прафесар Беларускай акадэміі музыкі Я.Гладкоў, мастацкі кіраўнік фальклорнага ансамбля "Крупіцкія музыкі" У.Гром, мастацкі кіраўнік ансамбля "Паазер'е" А.Собаль, прэзідэнт Сусветнай цымбальнай асацыяцыі В.Харэнчар (7).

Традыцыйнымі сталі рэспубліканскія фестывалі "Беларускія дудары" і "Іграй, гармонік!". Адметнасцю гэтых фестываляў былі выстава гармонікаў з розных рэгіёнаў Беларусі з удзелам саміх майстроў і дзейнасць творчай лабараторыі. У яе рабоце ў час фестывалю прынялі ўдзел вядучыя спецыялісты рэспублікі ў жанры духавой музыкі, якія правялі семінары, кансультацыі для кіраўнікоў самадзейных духавых аркестраў. У час падрыхтоўкі да фестывалю ў Беларускім інстытуце праблем культуры мастацкія кіраўнікі і дырыжоры самадзейных калектываў атрымалі метадычную дапамогу, прайшлі стажыроўку, змаглі набыць нотны матэрыял.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аб тым, што развіццё музычнай культуры ішло паспяхова, сведчаць разнастайныя фестывалі, святы і агляды, якія праводзіліся ў гэты час у розных раёнах Гомельскай і Магілёўскай абласцей.

---

1. Падлічана на аснове аналізу статыстычных аглядаў тэатральна-відовішчных і культурна-асветных установ сістэмы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь за 1990 — 1993 гг.// Культурнае жыццё Рэспублікі: Стан, праблемы, тэндэнцыі... — Мн., 1998.
2. Там жа.–С.3.
3. Падлічана на падставе аналізу статыстычных аглядаў тэатральна-відовішчных і культурна-асветных установ сістэмы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь за 1994 — 1997 гг.
4. Культурнае жыццё рэспублікі: Стан, праблемы, тэндэнцыі... — Мн., 1998. — С.36.
5. Там жа. — С.36.
6. Там жа. — С. 34.
7. Мастацтва. — 1997. — №6. — С.21.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ